героя, а як патрэбныя ў першую чаргу аўтару часткі карціны. Такім падаецца *герой-іншы*.

Асаблівую важнасць супрацьпастаўленне "я – іншы" набывае ў рэлігійнай паэзіі, у першую чаргу праз вобразы ўзорнага верніка і Хрыста, Бога. Бахцін адзначаў: "Ва ўсіх нормах Хрыста супрацьпастаўляюцца *я* і *іншы*: абсалютная ахвяра для сябе і ласка для іншага" [1]. Адпаведна, усе людзі падзяляюцца "на яго адзінага і ўсіх іншых людзей, яго – які мілуе, і іншых – каго мілуюць, яго – збавіцеля, і усіх іншых – каму збаўляюць, яго – які бярэ на сябе цяжар граху і адкуплення, і ўсіх іншых – вызваленых ад гэтага цяжару і адкупленых" [1].

У постсекулярнай паэзіі гэтыя апазіцыі могуць станавіцца важнай часткай літаратурнай гульні аўтара. Так, напрыклад, у вершы А. Хадановіча "Пральня" [3, с.63] Бог – *герой-іншы*, у тэксце ён усюды названы як "Б." – такі вось спосаб аўтара не парушаць запавет пра дарэмную згадку. Сам верш – гэта пэўнае пераўвасабленне гісторыі пра Садом і Гамору, тут яна пададзена з боскага боку. Менавіта аддаленасць Бога як *героя-іншага* дазваляе аўтару па-мастацку пераўвасобіць вядомую гісторыю, бо адлюстраванне Бога як я-героя не дазволіла б надаць яго паводзінам крытычную мастацкую ацэнку, якая і робіць гэты твор адметным. Функцыя Бога як збаўцы, а людзей як аб'ектаў яго збаўлення, якая з боку Бога выглядае святой і неаспрэчнай, з пазіцыі аддаленага назіральніка выклікае іранічнае сумненне:

Горад сохне на ветры. Чакае золку.
Удыхае азон. Сустракае святло.
Зранку над пральняй Б. запаліў вясёлку –
знакам, што сегрэгацыі не было [3, с.63].

**Заключэнне.** У айчынным літаратурным працэсе апошніх дзесяцігоддзяў праяўляецца ўсё большая схільнасць пісьменнікаў да адлюстравання рэлігійнага ў постсекулярным рэчышчы: з аднаго боку тут мае месца дэсакралізацыя, "зніжэнне" рэлігійных вобразаў і сюжэтаў, але ў той жа час захоўваецца іх святасць і практычна адсутнічаюць негатыўныя адносіны да іх.

Па-новаму вызначыць і падрабязна апісаць вышэйзгаданыя тэндэнцыі дапамагаюць універсальныя тэарэтычныя падыходы, прапанаваныя вучоным Міхаілам Бахціным. У прыватнасці, пры аналізе сучаснай рэлігійнай паэзіі важных высноў дапамагае дасягнуць разгляд тэксту з пункту гледжання выяўлення ў ім аўтара і героя.

1. Бахтин, М.М. Автор и герой в эстетической деятельности. [Электронный ресурс] / Михаил Бахтин – Infolio: Университетская электронная библиотека. – Режим доступа: http://www.infoliolib.info/philol/bahtin/indexa.html#1. – Дата доступа: 28.11.2021.
2. Прылуцкі, С. Герой эпохі стабільнасці / С. Прылуцкі. – Мінск: Логвінаў, 2013. – 136 с.
3. Хадановіч, А. Школа травы : кніга вершаў / А. Хадановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2019. – 84 с.

## ГАЗЕТНЫ ЗАГАЛОВАК ЯК СРОДАК ПРЭЗЕНТАЦЫІ ЗМЕСТУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»)

***Маркевіч Э.М.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Мартынкевіч С.В.,** канд. пед. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Мова СМІ, літаратурная газета, газетны загаловак, цытата, змест.
Keywords. Media language, literary newspaper, newspaper headline, quote, content.

Загаловак – гэта "нераскрыты змест тэксту; у ім выяўляецца асноўная задума, ідэі, канцэпт аўтара" [3, с. 27]. Менавіта загаловак з'яўляецца паўнавартасным элементам газетнага тэксту, уваходзіць у яго і звязаны з іншымі кампанентамі цэласнага твора. Загаловак мае вельмі важнае значэнне для газетнага артыкула, паколькі ён з'яўляецца першаэлементам, што дае пачатковае ўражанне і фарміруе думку пра змест гматэрыялаў газеты ў цэлым. Загалоўкі, а дакладней іх "стыль, лексіка, мастацкія і дызайнерскія прыёмы, арыентуюць чытача ў газеце, вызначаючы жаданне чытаць далей ці адкласці нумар у бок" [1, с. 41].

Адным з аб'ектаў сучасных лінгвістычных даследаванняў з'яўляюцца загалоўкі газет паводле іх выразнасці ў прэзентацыі зместу артыкула. Актуальнасць дадзенай тэмы таксама абумоўлена недастатковай даследаванасцю сучасных падыходаў да выбару і тварэння загалоўкаў газеты як першаэлементу прэзентацыі яе зместу. Мэта даследавання – лінгвістычны аналіз загалоўкаў газеты "Літаратура і мастацтва" і выяўленне асаблівасці іх выбару ў публіцыстычным літаратурным выданні.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на матэрыяле газеты "Літаратура і мастацтва". Выкарыстаны наступныя метады: апісальна-класіфікацыйны, сістэмнага аналізу, навуковага назірання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У вялікай колькасці сродкаў масавай інфармацыі газета павінна быць "канкурэнтаздольнай на фоне сучасных медыя і разнапланавых інтэрнэт-рэсурсаў" [2, с. 233]. Выразная прэзентацыя зместу артыкула адбываецца праз загалоўкі, якія найбольш прыцягваюць увагу чытача сваёй структурай і сэнсавай напоўненасцю. У працэсе лінгвістычнага аналізу матэрыялаў газеты "Літаратура і мастацтва" былі выяўлены наступныя прыёмы стварэння загалоўкаў:

1) Цытаванне. Загалоўкі пабудаваны на цытаце, якія адсылаюць да вядомых тэкстаў мастацкай літаратуры. Пры дапамозе цытатных загалоўкаў аўтар надае тэксту вобразнасць і прыцягвае ўвагу тых чытачоў, якія з'яўляюцца прыхільнікамі той ці іншай галіны літаратуры і мастацтва. Напрыклад: загаловак *«Якім нарадзіўся, такім мяне ешце...»* [№14, 8.05.2022, с. 15] цытата са знакамітага верша Масіма Танка "Якім нарадзіўся"; у публікацыі *«Тчэ, забыўшыся, рука...»* [№8, 28.02.2020, с. 2] скарыстаны радок з верша Максіма Багдановіча "Слуцкія ткачыхі" і інш.

2) Уласныя імёны – гэта адзінкі мовы, якія абазначаюць канкрэтную асобу або адзінкавы прадмет, вылучаючы яго сярод іншых. Напрыклад, такія імёны, як Яўхім Глушак, Гарлахвацкі, Руслан і Людміла, Васіль Цёркін і іншыя. Чалавеку ўласціва праецыраваць свае ўяўленні пра таго ці іншага персанажа, дзякуючы гэтаму тэкст артыкула можа па асацыяцыі звязвацца з цэлым колам падзей, напаўняцца сімвалічным, міфалагічным сэнсам. Функцыянаванне ўласных імён ў загалоўках газеты "Літаратура і мастацтва" мае сваю спецыфіку. Іх наяўнасць спрыяе таму, што чытач як бы нанова узнаўляеў асацыятыўныя сувязі слова, што, у сваю чаргу, адлюстроўваецца на пераасэнсаванні яго семантыкі, разумення аўтарскай задумы артыкула. Мы маем магчымасць вылучыць некалькі найбольш частотнаўжывальных тэматычных разрадаў уласных імён у газетных загалоўках "ЛіМ":

Антрапонімы – імёны, прозвішчы, імя па бацьку, мянушкі, псеўданімы. Напрыклад: *«Караткевіча згадалі ў Азербайджане»* [№46, 4.12.2020, с. 2], *«Багдановіч у незвычайным ракурсе»* [№ 52, 31.12.2021, с. 11], *«Урокі Язэпа Лёсіка»* [№8, 28.12.2020, с. 10], *«Лёс прадказаў Шырма»* [№1,6 22.05.2022, с. 15], *«Аўтарскае бачанне Міхася Пазнякова»* [№4, 29.12.2021, с. 10].

Тапонімы – уласныя імёны, якія ўказваюць на назвы геаграфічных аб'ектаў. Напрыклад: *«Мудрасць Усходу, прамоўленая па-беларуску»* [№ 14, 8.05.2022, с. 7], *«З берагоў быліннага Дуная»* [№7, 19.02.2021, с. 10], *«Што нясуць хвалі Нёмана»* [№46, 4.12.2020, с. 11], *«Госці з Нарачы ў Доме літаратара»* [№6, 14.02.2020, , с. 2], *«На берагах Свіслачы»* [№47, 11.12.2020, с. 3].

3) Загалоўкі-пытанні выкарыстоўваюцца журналістамі, перш за ўсё, з мэтай прыцягнення чытацкай увагі да праблемы матэрыялу і аптымізацыі чытання артыкула. Увесь тэкст служыць адказам на пастаўленае ў загалоўку пытанне. Напрыклад: *«Дзе расце «АРХідэя»?»* [№12 25.04.2022, с. 14], *«Ці ўратуе фэнтэзі літаратуру?»* [№20, 29.06.2020, с. 7].

4) Загалоўкі, якія выражаны пабуджальнымі сказамі. Дадзены від загалоўкаў не толькі прыцягвае ўвагу чытача, але і пабуджае яго да дзеяння. Напрыклад: *«Важна не стаяць на месцы!»* [№14, 8.05.2022, с. 2], *«Гайда ў дзяцінства!»* [№4, 28.01.2022, с. 2], *«Галоўнае — напоўніць цікавым зместам...»* [№9, 08.04.2022, с. 4], *«Спраўдзілася адна мара — пераходзь да наступнай»* [№14, 8.05.2022, с. 8].

Пэўную частку складаюць заалоўкі, якія утрымліваюць пэўны факт, які пакуль што невядомы чытачу альбо вядомы часткова. Напрыклад: *«Вандроўкі ў часе і прасторы»* [№14, 08.05.2022, с. 16], *«Герой, апавядальнік, аўтар»* [№4 29.12.2021, с. 7], *«Конкурс для перакладчыкаў»* [№4, 29.12.2021, с. 2], *«Літаратурны маніторынг»* [№4, 29.12.2021, с. 2], *«Новае слова ў беларускім літаратуразнаўстве»* [№16, 22.05.2022, с. 47], *«Прэмія за актуальнасць»* [№4, 29.12.2021, с. 1], *«Фінансавыя казкі для дзяцей» ад прафесійных эканамістаў»* [№ 20, 29.06.2020, с. 3].

**Заключэнне.** У ходзе даследавання былі прааналізаваны лінгвістычныя асаблівасці загалоўкаў газеты "Літаратуры і мастацтва". Лінгвістычныя назіранні над загалоукамі газеты паказалі нам, што ў выданні вялікую ўвагу надаюць падбору загалоўкаў, большасць з якіх здольны прыцягнуць засяроджаннасць чытача. Трэба адзначыць, што жанру газеты "Літраратура і мастацтва" адпавядаюць не ўсе сабраныя загалоўкі, па многіх з іх нельга вызначыць, да якога выдання – літаратурнага ці грамадска-палітычнага – яны адносяцца. Аднак па большасці з іх гэта можна зрабіць дакладна. Гэтаму спрыяе тэматычная лексіка, такая як *літаратура, творца, аўтар, чытач, мастацтва* і інш. Самымі шматлікімі сталі загалоўкі з цытатат. Група выразнай прэзентацыі больш шырокая, але тут трэба улічваць, што выбар загалоўкаў праводзіўся намі з умовай адбору толькі тых, якія больш за ўсё прыцягваюць увагу чытача, што не выключае пэўную долю суб'ектыўнасці.

1. Бугаева, И. В. Параметры привлекательного для целевой аудитории заголовка СМИ / И. В. Бугаева, К. М. Сидорченко // Известия Юго-Западного государственного университета. Сер. Лингвистика и педагогика. – 2019. – Т. 9, № 2(31). – С. 41–48.
2. Дрога, М. А. Особенности заголовков в современной российской прессе (на материале новостей о Китае) // Современный дискурс-анализ. – 2018. – № 3 (20). – Ч. 2. – С. 233–238.
3. Синкевич, Т. И. Лингвистика текста: учеб.-метод. комплекс по учеб. дисциплине для спец. (направление специальности) 1-21 05 02 Русская филология (по направлениям) / Т. И. Синкевич. – 2018. – 165 с. URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/13693/1/%2bСинкевич%20Лингвистика%20текста%20в%20работе.pdf (дата обращения: 09.09.2022)

## КОНЦЕПТОСФЕРА «ЗАЩИТА ОТЕЧЕСТВА» В СИМБОЛАРИИ ИДЕНТИЧНОСТИ ТУЛЯКА (НА МАТЕРИАЛЕ ПРЕЦЕДЕНТНЫХ ИМЁН)

***Мозгачёва К.С.,***
*аспирантка ТГПУ им. Л.Н. Толстого, г. Тула, Россия*
*Научный руководитель – **Токарев Г.В.,** доктор филол. наук, профессор*

Ключевые слова. Концептосфера, лингвокультурология, прецедентные имена, региональная идентичность.
Keywords. Conceptosphere, linguoculturology, precedent names, regional identity.

Исследование «Символарий региональной идентичности» выполнено за счет средств гранта Российского научного фонда № 22-28-20342 и Правительства Тульской области (соглашение № 6 от 19 апреля 2022 г.).

Понятие *прецедентности* впервые было введено Ю. Карауловым. Теория прецедентности охватывает практически все сферы нашей повседневной жизни. Интерес к изучению данной темы объясняется, с одной стороны, малоизученностью, а с другой, широтой материала исследования. В настоящей статье предлагается апробация результатов составления словаря региональной идентичности Тульского края.

**Материал и методы.** Достижение поставленной нами цели достигается экспериментальным путём, методом выявления типичных признаков.

**Результаты и их обсуждение.** Прецедентные имена должны быть понятны и очевидны для лингвокультурной общности. Г. В. Токарев в своей монографии говорит о том, что «единицы культурного симболария появляются и функционируют в том или ином культурном тексте – знаковом пространстве, неоднородном или однородном по своей семиотической природе». [1, 17]. Так, прецедентные имена Тульского края, являясь составляющей частью симболария региональной идентичности, отображают наивную кар-